публікі настойліва паўтарае, што будаўніцтва сацыялістычнай дзяржавы немагчыма без адукаваных людзей. Больш таго, ствараюцца адпаведныя структуры, каб навучыць грамаце старэйшыя ўзроставыя групы насельніцтва, якія не мелі магчымасці ў ранейшыя гады вучыцца ў школе.

Са сказанага напрашваецца вывад; адукацыя і дзяржаўнасць - з'явы дыялектычна ўзаемазвязаныя. Беларусь у сілу асаблівасці яе гістарычнага шляху так і не змагла ў поўнай меры стварыць нацыянальную сістэму адукацыі і моцную нацыянальную дзяржаву.

УДК 947.6

П.С.Кручак, асістэнт

## АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПЕДАГАГІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ М.В.ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКАГА (1906-1917 гг.)

Вядомы беларускі гісторык і грамадскі дзеяч М.В.Доўнар-Запольскі (1867-1934) праявіў сябе і як таленавіты педагог-арганізатар. Асабліва ярка гэты накірунак дзейнасці вучонага праявіўся ў 1906-1917 гадах, калі М.В.Доўнар-Запольскі з'яўляўся арганізатарам і кіраўніком першай у Расійскай імперыі навучальнай установы з эканамічным ухілам - Кіеўскага камерцыйнага інстытута.

У гэты час, калі краіна ўступіла ў новы этап свайго эканамічнага развіцця, само жыццё патрабавала спецыялістаў з вышэйшай эканамічнай адукацыяй, якія б маглі працаваць у розных галінах народнай гаспадаркі. З гэтай мэтай пры падтрымцы Міністэрства прамысловасці і гандлю ў 1906 г. М.Доўнар-Запольскі адкрывае ў Кіеве вышэйшыя камерцыйныя курсы, якія ў хуткім часе атрымалі статус інстытута. М.Доўнар-Запольскі з'яўляўся не толькі арганізатарам і нязменным кіраўніком, але і сапраўднай душой новай навучальнай установы. Пазней ён пісаў, што пачынаць працу прыходзілася амаль што з нуля - не было ні сродкаў, ні вучэбных праграм, ні выкладчыкаў, згодных працаваць ва ўстанове новага тыпу. Усё даводзілася арганізоўваць самому дырэктару. Яму ўдалося дабіцца падтрымкі мясцовых гандлёва-прамысловых колаў. Гэта дало свае вынікі. Калі ў 1907 г. інстытуту належаў адзін маленькі домік, то ўжо ў 1917 г. ён з'яўляўся ўласнікам амаль паловы квартала шматпавярховых будынкаў з добрымі аўдыторыямі, багатай бібліятэкай і адзіным на ўсю краіну гандлёва-прамысловым музеем.

Галоўнае ж было ў самой сістэме навучання. Кіеўскі камерцыйны інстытут падначальваўся не Міністэрству народнай асветы, а Міністэрству прамысловасці і гандлю, якое адрознівалася сваім лібералізмам і якое да-

ла інстытуту максімум самастойнасці ў вызначэнні прадметаў і спосабаў навучання.

Таму М.Доўнар-Запольскі атрымаў у гэты час магчымасць у поўнай ступені ажыццявіць свае педагагічныя ідэі. У 1907 г. у артыкуле "Новый тип высшего образования" ён пісаў, што галоўнай мэтай інстытута з'яўляецца аб'яднанне эканамічнай адукацыі з практычнай накіраванасцю навучання.

Зыходзячы з гэтай мэты і складаліся вучэбныя планы. У інстытуце існавала два аддзяленні, на якіх вывучаліся навукі тэарэтычнага і практычнага характару, а таксама некалькі замежных моў. Акрамя таго, савет інстытута не абмяжоўваўся тэарэтычнай падрыхтоўкай навучэнцаў і экскурсіямі іх у прамысловыя цэнтры Расіі. З мэтай знаёмства студэнтаў з арганізацыяй і дзейнасцю ў вядучых індустрыяльных краінах савет інстытута вырашыў штогод пасылаць 10-15 студэнтаў на стажыроўку ў ЗША, Англію, Францыю, Германію,Італію, Бельгію і нават Сірыю і Палестыну. Усё гэта прывяло да таго, што інстытут карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод моладзі.

Акадэмік К.Астравіцянаў пісаў пазней у сваіх успамінах аб часе, праведзеным у Кіеўскім камерцыйным інстытуце: "Свободная студенческая жизнь казалась жизнью в каком-то другом мире, будто из мрачного подземелья я попал на свежий воздух".

Акрамя дырэктарства ў інстытуце, М.Доўнар-Запольскі чытаў на абодвух аддзяленнях лекцыі па эканамічнай гісторыі Расіі, а таксама на эканамічным аддзяленні -лекцыі па гісторыі рускага дзяржаўнага права і па новай гісторыі Расіі. Прычым курс эканамічнай гісторыі, па якім прафесар вёў і практычныя заняткі, не чытаўся болей ні ў адной навучальнай установе краіны і цалкам быў складзены самім М.Доўнар-Запольскім.

Лекцыі карысталіся вялікай цікавасцю сярод студэнтаў. Былы студэнт інстытута Д.Куманаў успамінаў пазней: "Не в пример другим профессорам, нередко насчитывавшим по 10-15 слушателей ( посещение лекций было необязательным), директор института нередко собирал полную аудиторию. Он действительно умел привлекать студентов. Особенно ему удавались лекции по крепостному праву. Здесь он иллюстрировал крепостной быт и крепостные нравы очень яркими фактами, и его слушали с неослабляемым интересом".

Доўгі час М.Доўнар-Запольскаму ўдавалася пазбягаць канфліктаў у інстытуце, у той час калі ў суседніх навучальных установах часта прыбягалі да дапамогі паліцыі. Але ў 1912 г. абставіны змяніліся. Кіеўскаму камерцыйнаму інстытуту быў нададзены статус дзяржаўнай навучальнай установы, чаго дабіваліся самі студэнты, каб пазбегнуць прызыву ў армію. Але адначасова з гэтым уводзілася і 5% -е абмежаванне на прыём студэн-

тау-яўрэяў, якое існавала ва ўсіх дзяржаўных установах. Гэта выклікала вялікую незадаволенасць. Да 1912 г. яўрэі складалі больш за палову ад агульнага ліку студэнтаў. А зараз многія з іх былі вымушаны пакінуць інстытут. Хаця 5% -я норма ў інстытуце ніколі не выконвалася, М.Доўнар-Запольскага сталі лічыць ледзь не галоўным віноўнікам увядзення новых патрабаванняў.

Яго адносіны са студэнтамі рэзка сапсаваліся. Адбываліся нават абструкцыі яго лекцый. Вучоны вельмі цяжка перажываў гэтыя змены. Ён нават хацеў пакінуць Кіеў і звярнуцца да міністра юстыцыі з просьбай аб прадстаўленні яму месца дырэктара маскоўскага архіва Міністэрства юстыцыі. Але ў пераездзе ў Маскву яму было адмоўлена. М.Доўнар-Запольскі па-ранейшаму займаў пасады дырэктара камерцыйнага інстытута і прафесара кафедры рускай гісторыі універсітэта.

У сакавіку 1917 г. заняткі амаль не праводзіліся. Інстытут быў запоўнены мітынгуючымі студэнтамі і рабочымі. Дырэктар рабіў усё магчымае, каб наладзіць кантакт са студэнтамі. Сходы і мітынгі было прапанавана праводзіць пасля заканчэння лекцый у вылучаных для гэтай мэты памяшканнях. У інстытут былі зноў прыняты звольненыя раней студэнты-яўрэі. М.Доўнар-Запольскі падтрымаў патрабаванні студэнтаў аб дапушчэнні іх прадстаўнікоў на пасяджэнні вучонага савета інстытута. Але значная большасць выкладчыкаў адвергла гэту прапанову.

А праз некалькі дзён быў праведзены агульны сход выкладчыкаў з павесткай дня аб паводзінах дырэктара інстытута. Прычым самога дырэктара на сход не запрасілі. Калегі абвінавацілі М.Доўнар-Запольскага ў правядзенні кансерватыўнай палітыкі, у няздольнасці весці дыялог са студэнтамі і інш. Пратакол сходу быў накіраваны на разгляд у Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Вучоны быў абражаны такімі паводзінамі сваіх калег, многіх з якіх у інстытут ён запрасіў асабіста, і падаў у адстаўку з пасады дырэктарства інстытута.Болей таго, нягледзячы на тое,што вучоны працягваў заставацца прафесарам інстытута, ён болей не прысутнічаў ні на адным пасяджэнні вучонага савета. А восенню 1917 г. ён наогул адмовіўся чытаць лекцыі ў інстытуце, абгрунтаваўшы свой адказ дрэнным станам здароўя і тым, што яго курс наогул не чытаўся ў іншых навучальных установах краіны, а поўнасцю выкладаўся па ініцыятыве самога дырэктара і таму не з'яўляецца абавязковым. Так М.Доўнар-Запольскі аказаўся па-за сценамі навучальнай установы, якую ён стварыў і ўзначальваў на працягу дзесяці гадоў. Але гісторыя кожнаму аддае па заслугах. І сёння Кіеўскі інстытут народнай гаспадаркі звярнуўся да ўрада Украіны з прапановай прысвоіць яму імя першага дырэктара - Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага.